# Канцэпцыя вучэбнага дапаможніка «Буквар»

## Для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання



**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага
і рускага мовазнаўства БДПУ
імя М. Танка, дацэнт



**В. І. ЦІРЫНАВА,**
кандыдат педагагічных навук,
дактарант НІА, дацэнт

**Тэарэтычнае абгрунтаванне прынцыпаў адбору вучэбнага матэрыялу і формы яго падачы ў вучэбным дапаможніку**




Вучэбны дапаможнік «Буквар» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання распрацаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай «Навучанне грамаце», зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь [1]. У якасці зыходных пазіцый для распрацоўкі буквара выбраны асноўныя палажэнні кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага і асобасна-арыентаванага падыходаў.

Рэалізацыя *кампетэнтнаснага падыходу* ў навучанні грамаце азначае ўлік таго, што буквар — асобы падручнік, па якім вучань авалодвае спосабам здабывання ведаў — вучыцца чытаць, каб у далейшым пры дапамозе навыку чытання атрымліваць інфармацыю з розных крыніц.

У сістэму работы па буквары ўключаюцца выхаваўчыя задачы. Іх вырашэнне мяркуецца, у тым ліку, і праз знаёмства з культурным (намінатыўным, эмацыянальным, экспрэсіўным, ацэначным, вобразным, матывацыйным) значэннем вывучаемых адзінак мовы (слоў, фразеалагізмаў, прыказак, формул маўленчага этыкету, тэкстаў культуразнаўчага характару). Гэта звязана з рэалізацыяй *лінгвакультуралагічнага падыходу* ў навучанні грамаце.

Пры вызначэнні паслядоўнасці вывучэння гукаў і літар улічваецца, якая лексіка ў першую чаргу патрэбна на пачатковым этапе навучання чытанню, якія літары патрэбны для яе перадачы на пісьме. Гэта дае магчымасць на самых ранніх стадыях навучання прапанаваць для чытання вялікую колькасць слоў, значна павысіць якасць тэкставага матэрыялу і рэалізаваць *камунікатыўна-дзейнасны падыход* да навучання грамаце.

Вучэбны дапаможнік прадугледжвае рэалізацыю *асобасна-арыентаванага падыходу* ў навучанні грамаце. Дыдактычны матэрыял буквара накіраваны на развіццё асобы навучэнцаў, задавальненне іх адукацыйных запатрабаванняў, інтарэсаў,

творчых магчымасцей. Прысутнічае матэрыял для дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, што звязана са значнымі адрозненнямі ў агульным развіцці і ў гатоўнасці да чытання і пісьма дзяцей, якія прыйшлі ў I клас.

Працэс навучання грамаце разглядаецца як пачатак моўнай адукацыі вучняў. Лінгвістычны матэрыял у вучэбным дапаможніку падаецца ў сістэме. Узровень падачы даступны для разумення навучэнцам 6-7-гадовага ўзросту. Адбываецца знаёмства з асноўнымі моўнымі адзінкамі (тэкст, сказ, слова, гук), яны засвойваюцца на практычнай аснове. Улічваюцца асаблівасці беларускай фанетычнай сістэмы. Вучні атрымліваюць веды пра складовую структуру слова, націск, падзел гукаў на зычныя і галосныя, падзел зычных на цвёрдыя і мяккія, пра націскныя і ненаціскныя галосныя. Улічваецца тое, што арыенціровачная аснова дзеяння чытання пабудавана на *прынцыпах беларускай графікі (складовым і гукавым)*.

У аснову навучання першапачатковаму чытанню па прапанаваным буквары пакладзены *гукавы аналітыка-сінтэтычны метад*. За аснову аналітычнай і сінтэтычнай работы ў дапаможніку бярэцца гук (літара ўводзіцца як абазначэнне гука пасля знаёмства з ім).

Паколькі першапачаткова дзеянне чытання заключаецца ў тым, каб у працэсе работы зрокавага аналізатара здабываць гукавыя комплексы, прывычныя для слыхавога апарату, а мінімальнай адзінкай маўлення чалавека з'яўляецца склад, то за адзінку чытання бярэцца склад. Пры чытанні літары ў слове аналізуецца яе пазіцыя, высвятляецца яе функцыя, што дапамагае спасцігаць механізм функцыянавання літарных знакаў. Галоўнае ў дзеянні чытання — патрэбнасць разумення прачытанага. Галоўнымі носьбітамі сэнсу слова з'яўляюцца літары зычных гукаў.

*Складовы прынцып беларускай графікі* таксама патрабуе асобай увагі да літары зычнага гука, паколькі большасць літар зычных гукаў *(б, в, г, з, к, л, м, н, п, с, ф, х, ц)* патрабуюць аналізу іх постпазіцыі *(канькі)* і, па сутнасці, вызначаюць кірунак руху зрокавага аналізатара — злева направа (к а н ь к і). У сувязі з гэтым букварны перыяд навучання грамаце пачынаецца з вывучэння зычных гукаў і адпаведных літар.

Развіццё маўлення і мыслення навучэнцаў адбываецца пры выкананні спецыяльных практыкаванняў са словамі (лагічныя практыкаванні тыпу групоўкі, абагульнення і класіфікацыі, назіранняў над аманімічнасцю, мнагазначнасцю слоў, антонімамі, сінонімамі, словаўтварэннем і словазмяненнем), словазлучэннямі і сказамі (складанне спалучэнняў слоў і сказаў па малюнках, развіццё сказаў па схемах і інш.), над звязным маўленнем (складанне вусных апавяданняў па малюнках, па серыі малюнкаў, па ўласных назіраннях, пераказ тэксту па пытаннях).

У якасці наглядных сродкаў у працэсе авалодання чытаннем выкарыстоўваюцца прадметныя і сюжэтныя малюнкі, схемы сказаў, схемы-мадэлі аналізуемых слоў, розныя варыянты складовых табліц. Прымяненне графічных схем-мадэлей сказаў, слоў, гукаў дапамагае ўвесці вучняў у гукавую матэрыю мовы, служыць апорай пры вывучэнні і выдзяленні моўных адзінак.

Матэрыял на кожнай старонцы буквара аб'яднаны па тэматычным прынцыпе. Вучэбныя заданні даюцца пераважна ў гульнявой форме.

Буквар забяспечвае рэалізацыю ў адукацыйным працэсе ўсіх асноўных *дыдактычных прынцыпаў* (свядомасці і актыўнасці, нагляднасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, трываласці, навуковасці, даступнасці і інш.). У сукупнасці гэтыя прынцыпы адлюстроўваюць усе вядучыя патрабаванні да адукацыйнага працэсу і забяспечваюць навукова абгрунтаваную пастаноўку мэт, адбор зместу, метадаў і сродкаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці першакласнікаў у перыяд навучання грамаце.

**Мэты і задачы вучэбнага дапаможніка «Буквар»**

Буквар рэалізуе *асноўныя функцыі* вучэбнага дапаможніка па навучанні грамаце — фарміраванне механізму чытання, развіццё маўлення і лагічнага мыслення вучняў — і забяспечвае дасягненне *мэты* навучання грамаце, заяўленай у вучэбнай праграме: фарміраванне базавых ведаў, уменняў і навыкаў чытання і пісьма, агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеянняў; развіццё асноўных відаў вуснага і пісьмовага маўлення, пазнавальнага інтарэсу; выхаванне маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін [1].

Паколькі вучэбны дапаможнік «Буквар» з'яўляецца асноўным сродкам навучання грамаце, ён забяспечвае рашэнне наступных *задач*: развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і выдзяляць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць); фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў беларускай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё ўмення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі; навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму; развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў працы з рознымі крыніцамі інфармацыі; узбагачэнне слоўнікавага запасу; развіццё звязнага вуснага маўлення; фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці [1].

Новы буквар [2] прадугледжвае павелічэнне аб'ёму маўленчай і фанетычнай працы, забяспечвае мэтанакіраваную адпрацоўку ***гукавога аналізу***

***слоў***. Сістэматычная гукавая праца неабходна не толькі тым вучням, якія пачынаюць вучыцца чытаць, але і тым, якія прыйшлі ў школу, умеючы чытаць. Апошнія прывыклі арыентавацца на літару, таму аналіз слова, якое гучыць, з'яўляецца для іх новым і цяжкім відам дзейнасці, які належыць засвоіць разам з аднакласнікамі ў перыяд навучання грамаце. Ад умення чуць і вылучаць гукі ў слове залежыць здольнасць навучэнцаў заўважаць пры пісьме «небяспечныя месцы», перадаваць на пісьме змены галосных і зычных. На аснове гэтага ажыццяўляецца мэтанакіраваная ***першапачатковая праца*** па фарміраванні ў першакласнікаў арфаграфічнай пільнасці.

Працэс навучання першапачатковаму чытанню рэалізуецца на аснове заканамернасцей маўленча-моўнага развіцця навучэнцаў 6-гадовага ўзросту і асаблівасцей фарміравання ў іх усіх відаў маўленчай дзейнасці: слухання, гаварэння, чытання і пісьма.

**Абгрунтаванне размеркавання вучэбнага матэрыялу па раздзелах і вучэбных тэмах (структураванне вучэбнага дапаможніка)**

Структураванне вучэбнага дапаможніка «Буквар» звязана з перыядамі навучання грамаце: падрыхтоўчым (дабукварным), асноўным (букварным) і заключным (паслябукварным).

На **падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд** навучання грамаце адводзіцца 12 гадзін. У гэты час адбываецца знаёмства з асноўнымі моўнымі адзінкамі (сказ, слова, склад, гук). Вучні атрымліваюць агульнае ўяўленне пра вуснае і пісьмовае маўленне, кароткія звесткі з гісторыі стварэння кніг.

У лінгвістыцы сказ — гэта выказванне, якое ўтрымлівае паведамленне пра што-небудзь і разлічана на слыхавое і зрокавае ўспрыманне. У дадзеным кантэксце тэрмін «сказ» выкарыстоўваецца ў значэнні як вуснага, так і пісьмовага выказвання. Буквар прадугледжвае работу па фарміраванні элементарных уяўленняў пра функцыі сказа (сказ выражае закончаную думку, у ім пра штосьці або пра кагосьці гаворыцца). Вылучэнне сказа з маўленчай плыні адбываецца з апорай на наступныя яго прыметы: закончанасць думкі, інтанацыйную завершанасць.

Уводзіцца схема для абазначэння сказа, якая фіксуе ўвагу вучняў на афармленні гэтай сінтаксічнай адзінкі на пісьме: вялікая літара ў пачатку сказа, знак прыпынку (. ? !) у канцы.

Арганізуецца работа над інтанацыяй сказа.

Вучні вызначаюць паслядоўнасць і колькасць слоў у сказе. Вылучэнне слоў са сказа ажыццяўляецца праз пастаноўку пытанняў да кожнага слова ў сказе або шляхам выдзялення слоў у сказе працяглымі паўзамі.

***Слова*** разглядаецца як структурная адзінка сказа. Ажыццяўляецца знаёмства з намінатыўнай роляй слова, з тым, што слова мае значэнне (сэнс) — словамі называюць прадметы, іх прыметы і дзеянні.

У падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце пачынаецца знаёмства вучняў з сістэмай ***гукаў мовы***. Вучэбная праграма прадугледжвае фарміраванне ўмення выдзяляць гук у пачатку слова, адрозніваць гукі на слых і пры вымаўленні, падбіраць словы з зададзеным гукам. У гэты перыяд пашыраюцца уяўленні вучняў пра сістэму гукаў беларускай мовы і прадугледжваецца знаёмства навучэнцаў з галоснымі і цвёрдымі і мяккімі, звонкімі і глухімі зычнымі гукамі, націскнымі і ненаціскнымі галоснымі, уводзіцца паняцце «склад» (націскны, ненаціскны). Вучні атрымліваюць уяўленне аб складовай структуры слова, націску. Прадметам параўнання становяцца склады ў слове, створаныя з аднаго і з некалькіх гукаў *(а-са)*. Навучанне падзелу слоў на склады адбываецца з улікам *прынцыпу ўзыходнай гучнасці*.

Вылучэнне гука арганізуецца шляхам паслядоўнага інтанавання (працяглага вымаўлення) кожнага гука ў цэлым слове. Вучням неабходна вымаўляць слова столькі разоў, колькі гукаў яно змяшчае.

Размежаванне галосных і зычных гукаў адбываецца па трох прыметах:

1) артыкуляцыйных (пры вымаўленні галосных струмень паветра не сустракае перашкод у поласці рота; пры вымаўленні зычных перашкоды ёсць);

2) акустычных (галосныя складаюцца амаль выключна з голасу, пры вымаўленні зычных чуецца голас і шум або толькі шум);

3) па функцыі (галосныя ўтвараюць склады, зычныя пры складападзеле далучаюцца да галосных).

На старонках дапаможніка, якія адпавядаюць дабукварнаму перыяду, размешчаны прадметныя і сюжэтныя малюнкі, схемы сказаў, слоў, гукаў.

Д. Б. Эльконін падкрэсліваў, што засваенне фанетычных паняццяў у перыяд навучання грамаце павінна праходзіць у працэсе актыўнага дзеяння, маніпулявання. Аснову вучэбнай дзейнасці на ўроках навучання грамаце складаюць практычныя і гульнявыя дзеянні, у працэсе выканання якіх у вучняў фарміруюцца адэкватныя вобразныя ўяўленні пра асноўныя лінгвістычныя адзінкі, што з'яўляецца важным і неабходным падмуркам для далейшага авалодання роднай мовай, звязным вусным і пісьмовым маўленнем.

У падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце выкарыстоўваецца асобая сістэма ***мадэлявання***, якая дазваляе на розных узроўнях абстракцыі графічна прадстаўляць моўныя адзінкі і перадаваць сістэмныя адносіны паміж імі. Навучэнцы засвойваюць графічнае абазначэнне сказа, слова, склада і націску.

Прыклады схем:



— сказ;

— слова;

— слова з двух складоў;

— слова з трох складоў з націскам на трэцім складзе;

— гук;

— зычны гук (цвёрды);

— зычны гук (мяккі);

— галосны гук.

З апорай на ўмоўныя графічныя схемы навучэнцы аналізуюць сказы, словы, гукі, вучацца свядома карыстацца засвоенымі тэрмінамі.

На **асноўны (букварны) перыяд** навучання грамаце вучэбнай праграмай адводзіцца 61 гадзіна. У гэты перыяд буквар прадугледжвае працяг практычнай работы з усімі моўнымі паняццямі, вывучанымі ў падрыхтоўчы перыяд; вывучэнне ўсіх літар алфавіта, авалоданне паўнацэнным навыкам чытання слоў, сказаў, тэкстаў.

Пачынаецца асноўны перыяд з вывучэння зычных гукаў і адпаведных літар. У новым буквары перагледжаны парадак увядзення літар. Адзначым, што з псіхафізіялагічнага пункта гледжання механізм расшыфроўкі літарнага кода, зададзенага ў складзе «зычны + галосны», гучыць так: «Глядзі, што за літарай зычнага гука». Далейшае ўвядзенне літар, якія абазначаюць галосныя гукі, дазваляе пачаць фарміраванне першапачатковага механізма чытання прамога склада (ЗГ), задаючы рух вачэй «ад зычнага да галоснага».

Прапаноўваецца наступны варыянт размеркавання вучэбнага матэрыялу.

Праца на старонках дапаможніка, прысвечаных вывучэнню першых трох літар зычных гукаў (С, Л, М), арганізуецца так: па прадметных малюнках у двух словах выдзяляюцца парныя цвёрды і мяккі зычныя гукі. Са словамі-назвамі прадметаў складаюцца словазлучэнні, сказы. Навучэнцы практыкуюцца ва ўспрыманні выдзеленых гукаў на слых, вызначаецца месца гукаў у словах. Вучні знаёмяцца з літарамі для абазначэння ахарактарызаваных гукаў, чытаюць словы, словазлучэнні і сказы па схемах з апорай на літары зычных гукаў, прадметныя і сюжэтныя малюнкі.

Пасля вывучэння трох літар зычных гукаў уводзіцца першы галосны гук [а]. Гэта дае магчымасць пачаць практыкаваць вучняў у вылучэнні ў словах і чытанні адкрытых складоў «цвёрды зычны + галосны». Навучанне чытанню прамых складоў ажыццяўляецца «па падабенстве» *(са, ла, ма)*. Пасля гэтага ўводзіцца наступны галосны гук — [і]. Вучні практыкуюцца ў вылучэнні і чытанні адкрытых складоў «мяккі зычны + галосны», слоў з вывучанымі літарамі. Далейшае вывучэнне літар у букварны перыяд арганізуецца з чаргаваннем увядзення літар, якія абазначаюць галосныя і зычныя гукі: *ы, у, ў, г, п, т, о, э, р, ч, н, к, й, я, ю, е, ё, з, в, б, ц* і інш. Адбываецца знаёмства з мяккім знакам і апострафам. Звяртаецца ўвага на двайную ролю літар *я, ю, е, ё*.

На старонках буквара вядзецца работа з выкарыстаннем «ланцужкоў» складоў: адбываецца чытанне складоў і састаўленне з іх слоў.

га → ма → гу → лі → са → ла → сі → ла

У слупкі слоў для чытання на старонцы буквара ўключаюцца словы з вывучаемай літарай. Многія з гэтых слоў сустракаюцца ў тэкстах на старонцы.



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | лі | ліса | Ала | сам |
| | лілі | сіла | Сіма | сама́ |
| мі | ліліі | ласі | Мі́ла | са́мі |

Міла і Сіма —  і .

Міла і Сіма са́мі  ліліі. Міла

сама́ , а Сі́ма сама́ .

Прыцягваецца ўвага навучэнцаў да з'яў мнагазначнасці (*ключ, кубак* і інш.), аманіміі (*каса, бабка* і інш.), антаніміі (*сумна — радасна*), сінаніміі (*урач — доктар*). Праводзяцца слоўнікава-лагічныя практыкаванні (*Шпак — птушка, а карп — ?*). Уводзяцца прапедэўтычныя элементы граматыкі, словаўтварэння, арфаграфіі, лексікалогіі.

На **заключны (паслябукварны) перыяд** навучання грамаце вучэбнай праграмай адводзіцца

17 гадзін. Старонкі дапаможніка, якія адпавядаюць гэтаму перыяду, прадугледжваюць разнастайную працу са словам, сказам, тэкстам. На іх змешчаны невялікія творы розных жанраў, праца з якімі арганізуецца так, каб удасканаліць навык правільнага, плаўнага, свядомага чытання першакласнікаў. Прадугледжваюцца заданні на развіццё першапачатковага ўмення чытаць тэкст выразна, перадаваць свае адносіны да прачытанага.

**Пазакласнае чытанне.** Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз на два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

З мэтай выканання вучэбнай праграмы па раздзеле «Пазакласнае чытанне» ў буквар уключаны заданні, якія звязаны як з вучэбнай тэмай навучання грамаце, так і з тэмай пазакласнага чытання. Так, пры вывучэнні гука [і] і літар **І**, **і** вучням давядзецца не толькі чытаць і аналізаваць слова *ліса*, але і прыгадаць па малюнках беларускія народныя казкі, галоўнай гераіняй якіх з'яўляецца ліса («Лісіца і журавель», «Коцік, пеўнік і лісіца», «Зайкава хатка»). Акрамя таго, настаўнік зможа прачытаць дзецям адну з гэтых казак.

На занятках па пазакласным чытанні ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання. Вядучы метад навучання — чытанне-разгляд дзіцячых кніг.

Вучні выпрацоўваюць уменні адрозніваць кнігі па змесце, правільна называць іх, прачытваючы прозвішча аўтара і загаловак; называць герояў, узнаўляць змест эпізоду або сітуацыі з апорай на ілюстрацыю, расказваць аб прачытаным.

**Развіццё маўлення.** Праца па развіцці маўлення праводзіцца на кожным уроку на працягу вучэбнага года і ахоплівае ўсе асноўныя напрамкі маўленчага развіцця вучняў: развіццё гукавой культуры маўлення; слоўнікава-лексічную працу; развіццё граматычнага ладу маўлення; развіццё звязнага маўлення.

У рамках пераемнасці з дашкольнай адукацыяй працягваецца ўдасканаленне вымаўленчых навыкаў і развіццё фанематычнага слыху навучэнцаў.

Змест буквара прадугледжвае практычнае знаёмства вучняў з прыёмамі словаўтварэння, практыкаванні ў правільным ужыванні слоў-назваў прадметаў, прымет, дзеянняў, тэматычнай групоўцы слоў і ўстанаўленні іх рода-відавых адносін, падборы блізкіх і процілеглых па сэнсе слоў.

Развіццё звязнага маўлення вучняў ажыццяўляецца ў працэсе падрыхтоўкі разгорнутых адказаў на пытанні, складання вусных апавяданняў з апорай на сюжэтную ілюстрацыю ці серыю сюжэтных ілюстрацый, складання выказванняў на аснове жыццёвага вопыту.

Асноўнымі ўмовамі развіцця маўлення вучняў з'яўляюцца стварэнне ўмоў для ўзнікнення патрэбнасці ў зносінах, стварэнне сітуацый зносін, забеспячэнне разумення ўмоў зносін.

Такім чынам, метадычныя сродкі буквара даюць магчымасць настаўніку забяспечыць якаснае засваенне вучнямі вучэбнага матэрыялу па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы «Навучанне грамаце».

У змесце новага буквара закладзена лінія фарміравання вучэбных кампетэнцый малодшых школьнікаў, дзейнасны кампанент якіх складаюць агульнавучэбныя ўменні: вучэбна-дзейнасныя, вучэбна-арганізацыйныя, вучэбна-інтэлектуальныя, вучэбна-інфармацыйныя і вучэбна-камунікатыўныя.

### Склад вучэбна-метадычнага комплексу

Акрамя буквара, у склад *асноўных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу* (ВМК) уваходзяць вучэбныя дапаможнікі «Пропісь 1», «Пропісь 2», «Пісьмо» і вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў «Навучанне чытанню ў 1 класе» (у дзвюх частках), «Навучанне пісьму ў 1 класе».

*Дадатковыя кампаненты* ВМК уключаюць дапаможнікі для вучняў і настаўнікаў: «Рабочы сшытак да Буквара», «Пропісі з анімацыяй», «Спадарожнік буквара», «Пазакласнае чытанне. 1 клас», «Обучение письму. 1 класс. Наглядный материал», «Навучанне грамаце. 1 клас. Праверачныя работы» [3–8].

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Свірыдзенка, В. І. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Навучанне грамаце» для І класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2021. — № 4. — С. 9–14.
2. Свірыдзенка, В. І. Буквар : вучэб. дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. — 183 с.
3. Свірыдзенка, В. І. Рабочы сшытак да «Буквара» / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — Мінск : Аверсэв, 2021. — 48 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Пропісі з анімацыяй / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — Мінск : Аверсэв, 2021. — 48 с.
5. Свірыдзенка, В. І. Спадарожнік буквара : дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. — 199 с.
6. Пазакласнае чытанне. 1 клас : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / уклад. В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — Мінск : Аверсэв, 2021. — 80 с.
7. Тиринова, О. И. Обучение письму. 1 класс. Наглядный материал : учеб. наглядное пособие для учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. языками обучения / О. И. Тиринова. — Минск : Аверсэв, 2022. — 8 с. + [48] отд. л. плакатов.
8. Свірыдзенка, В. І. Навучанне грамаце. 1 клас. Праверачныя работы / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — Мінск : Аверсэв, 2023. — 64 с.